ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
1989
27
КРАСАВІКА
№ 15(1608)

ПРАШУ СЛОВА

ЁСЦЬ ДАПАЎНЕННІ

Нарэшце ў шэраг першарадных пастаўлены праблемы, якія непасрэдна звязаны з чалавекам і задавальненнем яго інтарэсаў. Калі яшчэ столькі ўвагі, як у праекце «Тэзісаў праграмы Мінскага гаркома КПБ і Мінгарвыканкома па рэалізацыі важнейшых задач перабудовы», надавалася вырашэнню задачы забеспячэння кожнай сям'і асобнай кватэрай ці індывідуальным домам? І ўсё ж не магу абысціся без невялікага ўдакладнення. Калі палова жыхароў Мінска займаюць плошчы, якім далёка да норм, устаноўленых гарвыканкомам, а 27 працэнтаў з іх ці не маюць уласнага жылля, ці вымушаны задавольвацца «аварыйнымі» дамамі, ёсць падстава прадаставіць жыллёвай праблеме першачарговае месца ў праграме, наперадзе пытанняў чаргі ў магазіне і дэфіцыту ў гандлі. Чамусьці не вылучаюцца ў праграме як асобныя некаторыя катэгорыі людзей: ваеннаслужачыя, якія звольнены ў запас па стану здароўя ці ўзросту, маладыя спецыялісты, накіраваныя па размеркаванню на прадпрыемствы Мінска, пенсіянеры і людзі перадпенсійнага ўзросту, якія жывуць у інтэрнатах і «камуналках», здымаюць кватэры. Такіх многа не толькі ў нашым працоўным калектыве. Таму, на мой погляд, праект мае патрэбу ў наступным дапаўненні: «Забяспечыць у 1989 годзе жыллёвай плошчай тых, хто адслужыў ва Узброеных Сілах СССР дваццаць і больш гадоў, быў звольнены ў запас па стану здароўя, узросту ці скарачэнню штатаў і стаяў у льготнай чарзе да 1 студзеня 1989 года. Астатнім гарантаваць атрыманне неабходнай жыллёвай плошчы не пазней, чым праз два гады пасля звальнення, прадаставіўшы прыгэтым, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, часовую жыллёвую плошчу:

— тым, хто не мае непаўналетніх дзяцей, якія б жылі разам — аднапакаёвыя;

— тым, хто жыве з непаўналетнімі дзецьмі ці з іншымі членамі сям'і — двухпакаёвыя кватэры».

Дзе вынайсці людскія рэсурсы для развіцця будаўнічай індустрыі? Можна, напрыклад, увесці (напачатку ў якасці эксперыменту) практыку датэрміновага выдзялення кватэр па чарзе райвыканкомаў тым сем'ям, якія жадаюць выконваць апрацоўчыя работы ўласнымі сіламі.

Рэзка паскараючы тэмпы будаўніцтва жылля, не абысціся без матэрыяльных і фінансавых выдаткаў. Як іх набыць? За кошт скарачэння капітальнага будаўніцтва, перараэмеркавання рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на будаўніцтва жылля, скарачэння ўпраўленчага, адміністрацыйна-гаспадарчага апарата і штатаў навукова-даследчых і галіновых інстытутаў. Цалкам рэальным бачыцца мне і перараэмеркаванне сродкаў, выдзеленых на навукова-даследчыя распрацоўкі і праграмы, якія не знойдуць выкарыстання ў бліжэйшыя пяць год.

Нягледзячы на колькасць кулуарных гутарак і пісьмовых скаргаў, не знікае транспартная праблема: не хапае скорасных аўтобусна-тралейбусных маршрутаў, якія б звязвалі жылыя кварталы з прамысловымі раёнамі, не задавальняе жыхароў і тэхнічны стан вуліц. У аўтааматараў свае цяжкасці, для якіх, на маю думку, не трэба шкадаваць асобнага пункта праграмы:

«Да 1995 года забяспечыць цалкам усіх уладальнікаў асабістага аўтатранспарту платнымі стаянкамі, задаволіць патрэбнасць у гаражах да 65—70 працэнтаў уладальнікаў, забяспечыць якасным сервісным абслугоўваннем да 100 працэнтаў».

Своечасова ўзнята пытанне аб значным паляпшэнні сацыяльна-бытавых умоў воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія служылі ў Афганістане. Аднак нельга пры гэтым забываць і пра тых, хто стаў інвалідам, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак у краінах сацыялістычнай садружнасці, краінах, якія развіваюцца, а таксама ў час выканання баявых задач на тэрыторыі СССР.

У «Тэзісах...» закладзена аснова рэалізацыі важнейшых задач перабудовы ў нашым горадзе, ажыццяўляць яе давядзецца кожнаму з нас.

М. КОЗЕЛ,
рэгуліроўшчык радыёапаратуры СКТБ з ВВ.

МАНАЛОГ

ЗАЦІКАЎЛЕНАГА ЧАЛАВЕКА

Цана савецкага дыплома



Я — прарэктар па міжнародных сувязях. Вельмі адказная пасада. Калі нагадаць, што БДУ імя У. І. Леніна вядзе падрыхтоўку спецыялістаў для замежных краін 26 гадоў, і падлічыць, што за гэты час універсітэт закончылі 7 129 замежнікаў: 4 872 навучэнцы падрыхтоўчага факультэта, 1 145 студэнтаў, 195 аспірантаў, 178 стажораў-выкладчыкаў, 739 студэнтаў-стажораў. Па колькасці замежных навучэнцаў наша вучэбная ўстанова займае вядучае месца сярод астатніх.

У апошні час у нашай краіне робіцца многае для паляпшэння жыцця студэнтаў-замежнікаў. Напрыклад, іх стыпендыя павялічылася з дзевяноста да ста рублёў.

Вельмі высакародная ў мяне пасада. Калі ўлічваць тое пачуццё, з якім замежнікі часцей за ўсё пакідаюць сцены універсітэта. Большасць з іх захоўвае добрыя ўражанні аб гадах вучобы ў нашай краіне на доўгі час. Гэта не мае тэарэтычныя здагадкі. І прадстаўнікі факультэтаў, і дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі атрымліваюць многа лістоў з падзякай ад выпускнікоў з розных куткоў нашай вялікай Зямлі. Гэта дае магчымасць меркаваць, што падрыхтоўка замежных спецыялістаў вядзецца ў нас на высокім прафесійным узроўні.

Я — прарэктар па міжнародных сувязях. Надзвычай клопатная ў мяне пасада. На першае месца ў дзейнасці дэканата па рабоце з замежнымі студэнтамі можна вылучыць пытанне аб паляпшэнні якасці выкладання, эфектыўнасці навучання і выхавання. Чаго мы дасягнулі? У 1985 годзе сярэдняя паспяховасць па універсітэту складала 93,6 працэнта, у 1986 годзе — 90 працэнтаў, у 1987 — 88 працэнтаў. Няхай не здзіўляе і не бянтэжыць вас паніжэнне працэнту паспяховасці. Гэта як раз тыя колькасныя змены, што сведчаць пра ўзровень якасці. Раней замежнікі нярэдка скардзіліся: «Патрабаванні на экзаменах і залiках у вас значна мякчэй. Для падрыхтоўкі да іх нам дастаткова двух дзён». Чуў і такія шчырыя словы: «З вучобай? Няма праблем. А калі яны ўзнікаюць, дастаткова спаслацца на цяжкасці з мовай ці «ўзяць» выкладчыка зморам, здараецца, паскардзіцца на няўдалае жыццё. Вось і атрымліваеш сваю «тройку». Для дыплома, паверце, дастаткова».

Перабудова ў сістэме вышэйшай і сярэдняй адукацыі ўнесла змены ў вучэбна-выхаваўчы працэс. Патрабаванні да замежнікаў цяпер строгія, без скідкі на «іншаземнасць».

Узровень ведаў маладых людзей, якія прыязджаюць да нас на вучобу, розны. Сустракаецца і вельмі нізкі. Быў час, калі пасля года навучання на падрыхтоўчым факультэце мы з вялікай нацяжкай адпраўлялі некаторых з іх на першы курс якой-небудзь ВНУ. Цяпер ёсць магчымасць падоўжыць тэрмін навучання на падфаку да двух гадоў. Гэта зусім не азначае, што быць адлічаным за непаспяховасць замежніку проста немагчыма. Толькі ў мінулым годзе на падрыхтоўчым факультэце было адлічана шэсць чалавек. Усе яны вымушаны былі вярнуцца ў свае краіны.

Павышэнне патрабаванняў выявілася ў больш актыўным удзеле замежных студэнтаў у навукова-даследчай рабоце. Аўтары навуковых работ Паўль Рэйнхард і Забіна Хоман былі лаўрэатамі XI агляду-конкурсу маладых вучоных і студэнтаў ГДР у Лейпцыгу (1987 г.), лаўрэатамі Усесаюзнай канферэнцыі замежных навучэнцаў «Сусветна-гістарычнае значэнне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» былі Ягіар Лізета, Рашаці Саід, Агата Самуль, Малгажата Маркевіч, Забіна Хоман, Чырыс Коку.

Вельмі вялікая праблема нашай выхаваўчай работы — канфлікты з удзелам замежных студэнтаў. Колькасць парушэнняў апошнім часам марудна, але скарачаецца. Найбольшы працэнт правапарушэнняў прыпадае на інтэрнаты, дзе агольваюцца і бытавыя беды. Мне здаецца, што ідуць яны ад неарганізаванасці і інертнасці нашых гаспадарчых служб. Цякуць краны, часта няма гарачай вады, выбіта шкло ў некаторых пакоях і калідорах, няма замкоў, ракавін... Наўрад ці хопіць пальцаў абедзвюх рук, каб усё падлічыць.

Няма пакуль і магчымасці забяспечыць студэнтаў (не толькі замежных) пастаянным месцам пражывання на ўсе пяць гадоў вучобы. За дзесяць месяцаў абжываюць яны пакоі, а пасля канікулаў вымушаны зноў займацца добраўпарадкаваннем з самага пачатку.

У існаванні выпадкаў п'янства, хуліганства, крадзяжу часам вінаватыя дэканаты асноўных факультэтаў, дзе не наладжана сістэматычная прафілактычная работа ў інтэрнатах.

Праблемы, праблемы... Неапраўданае драбленне па спецыяльнасцях, якое выконвае Дзяржкамітэт СССР па народнай адукацыі, накіроўваючы нам на некаторыя факультэты універсітэта невялікую колькасць студэнтаў, не дазваляе праводзіць, напрыклад, раздзельнае навучанне па грамадскіх дысцыплінах на першым і другім курсах; рэдакцыі рэспубліканскіх газет аддаюць перавагу фіктыўным даведкам ці характарыстыкам перад «цяганінай» з замежнымі практыкантамі факультэта журналістыкі...

Прапановы дэканата па рабоце з замежнымі студэнтамі па вырашэнню ўсіх гэтых пытанняў ужо падрыхтаваны. Значыць, праблемы хутка будуць вырашаны? Турбуе толькі, што голасу інтэрорганаў студэнцкага самакіравання — 38 замежнікаў у Савеце Дружбы і 18 у студэнцкіх Саветах дэканатаў — пакуль не чутна. Буду рады памыліцца.

А. ШАРАПА,
прарэктар па міжнародных сувязях.

ШТО НОВАГА?

Семінар грамадазнаўцаў

Метадычная камісія факультэта журналістыкі правяла чарговы семінар выкладчыкаў грамадазнаўчых дысцыплін — палітэканоміі, савецкай эканомікі, марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковага камунізму, гісторыі КПСС, сацыяльнай псіхалогіі, логікі.

З паведамленнем аб змесце вучэбных праграм, іх змяненні і ўдасканаленні, форме і метадах навучання выступілі дацэнты кафедраў псіхалогіі Л. М. Дзічкоўская, філасофіі гуманітарных факультэтаў Л. Ф. Кузняцова, палітэканоміі А. В. Афанасенка і іншыя.

Былі выказаны канкрэтныя прапановы па ўдасканаленню структуры вучэбных праграм і павелічэнню колькасці аўдыторных гадзін на выкладанне грамадазнаўчых дысцыплін;

па ўвядзенню на V курсе самастойнага або комплексных спецсемінараў па вучэбных дысцыплінах грамадазнаўчага цыклу;

па перанясенню выкладання ўсіх грамадазнаўчых дысцыплін на больш старшыя курсы;

па прыцягненню выкладчыкаў грамадазнаўчых навук да кіраўніцтва дыпломнымі і курсавымі працамі студэнтаў стацыянарнага і завочнага навучання журфака.

Дацэнт Л. М. Дзічкоўская выказала, у прыватнасці, думку аб увядзенні ў вучэбны план факультэта базавага курса «Агульная псіхалогія», што садзейнічала б больш трываламу засваенню студэнтамі сацыяльнай псіхалогіі.

На думку ўдзельнікаў семінара, гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі б павышэнню якасці падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, авалоданню студэнтамі неабходнымі ведамі ў галіне грамадазнаўчых навук.

А. НАРКЕВІЧ,
старшыня метадычнай камісіі факультэта журналістыкі, прафесар.

ЯК АРЫЕНТАВАЦЦА СТУДЭНТУ

ў бязмежным моры падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, дадатковай літаратуры? Як рыхтавацца да залікаў, экзаменаў, на чым акцэнтаваць увагу? Аказваецца, аблегчыць працу студэнта можна, для гэтага патрэбна папрацаваць... выкладчыкам. Аб тым, як ідуць справы з вучэбна-метадычнай дакументацыяй на біялагічным і геаграфічным факультэтах, на пасяджэнні рэктарата расказалі дэканы А. С. Шуканаў і Р. А. Жмойдзяк.

Члены рэктарата заслухалі таксама паведамленне начальніка вучэбнага аддзела В. М. Цясленкі аб выкананні факультэтамі і кафедрамі універсітэта плана ратапрынтных выданняў.

З. МІХНЕВІЧ.

УВАГА!

Прыміце да ведама: вучоныя, інжынеры, спецыялісты народнай гаспадаркі, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, аб'яднанняў.

Беларускае рэспубліканскае праўленне Усесаюзнага навукова-тэхнічнага таварыства радыётэхнікі, электронікі і сувязі імя А. С. Папова прымае ідэі і заказы на распрацоўку сіламі часовых творчых калектываў (ЧТК) навукова-тэхнічных праблем і праектаў у самыя кароткія тэрміны для прадпрыемстваў, як па месцу работы аўтараў, так і для іншых прадпрыемстваў, арганізацый, аб'яднанняў.

Ужо зараз спецыялістамі навукова-тэхнічнага таварыства выкананы высакаякасныя заказы на агульную каштарысную вартасць каля 300 тысяч рублёў. Іх з задавальненнем прынялі заказчыкі.

З ідэямі, прапановамі і заказамі звяртацца на адрас: 220050, г. Мінск, Ленінскі праспект, 10, п. 301. Тэлефоны для даведак: 22-53-47, 22-21-74.

Б. РОНЖЫК.

У ГОСЦІ ДА АМАТАРАЎ МУЗЫКІ

ў клуб цікавых сустрэч «Пакуль у вагоне нараджаюцца словы...» прыйшоў былы выпускнік факультэта радыёфізікі і электронікі, зараз інжынер Інстытута прыкладной фізікі АН БССР Уладзімір Максімкоў. Сустрэча адбылася ў Рэспубліканскім доме работнікаў мастацтва Саюза тэатральных дзеячаў БССР.

З. ВАЛНІСТЫ.

МЫ — ЗА ШУШКЕВІЧА! А ВЫ?



Шушкевіч Станіслаў Станіслававіч

Запомніце гэта імя — імя кандыдата ў народныя дэпутаты СССР, прарэктара па навуковай рабоце, загадчыка кафедры ядзернай фізікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Праграма кандыдата Шушкевіча С. С. — гэта ўзважаная і рэалістычная праграма вырашэння найбольш важных палітычных, эканамічных, сацыяльных і экалагічных праблем; праграма стварэння прававой дзяржавы на аснове поўнага сацыяльнага равенства ўсіх пластоў грамадства; праграма карэннага паляпшэння эканамічнага, аздараўлення экалагічнага становішча.

Праграма Шушкевіча С. С. — гэта прапановы выдатнага вучонага-фізіка, таленавітага арганізатара, Грамадзяніна і Патрыёта. Яны ўключаюць не толькі высакародныя мэты, але і канкрэтныя шляхі іх дасягнення.

Калі вы за здаровае, шчасце і дабрабыт, ваш і вашых дзяцей,— ГАЛАСУЙЦЕ ЗА КАНДЫДАТА С. С. ШУШКЕВІЧА.

ДЛЯ ЗНАЁМСТВА

Нарадзіўся 15 снежня 1934 года ў Мінску. Тут скончыў школу, універсітэт і стаў кандыдатам фізіка-матэматычных навук. У 1970 годзе ў Маскве абараніў доктарскую дысертацыю, а з 1973 года — прафесар.

Працаваў у АН БССР, на радыёзаводзе (зараз «Гарызонт»), у МРТІ. За 25 гадоў работы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна прайшоў сябе ўдумлівым выкладчыкам, вучоным і арганізатарам. Яго лекцыі — узор навуковасці, паслядоўнасці і яснасці выкладання. Кафедра ядзернай фізікі і электронікі, якую ён узначальвае, займае лідыруючыя пазіцыі па шэрагу навуковых напрамкаў на сусветным узроўні, яна падрыхтавала сотні спецыялістаў, у тым ліку і для многіх замежных краін.

У выніку ўкаранення ў народную гаспадарку распрацаванай, выкананых пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле С. С. Шушкевіча, атрыманы эканамічны эфект, які складае многія мільёны рублёў.

Яго запрашалі чытаць лекцыі ў некалькіх замежных універсітэтах, неаднаразова выступаў на прадстаўнічых міжнародных навуковых канферэнцыях.

Надрукаваў больш за 160 работ. Сярод іх—кнігі, падручнікі, навуковыя артыкулы.

Прыцыповы, нецярпімы да ўсялякай несправядлівасці. Валодае вялікім арганізатарскім талентам, здольны згуртаваць і захапіць людзей. Рашэнні прымае аператыўна, пачатую справу даводзіць да канца. Стрыманы ў абяцаннях, але бездакорны ў іх выкананні.

Адразу ж пасля Чарнобыльскай аварыі на базе вучэбных лабараторый кафедры за лічаныя дні былі створаны 25 высокавадкувальных вымяральных установак для аналізу харчовых прадуктаў. Некаторыя з гэтых «самаробак» і цяпер паспяхова працуюць на прадпрыемствах.

Групы маладых навуковых супрацоўнікаў кафедры С. С. Шушкевіча тройчы ўдастойваліся прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, а ён сам — лаўрэат Дзяржпрэміі БССР (1988 г.), прэміі Савета Міністраў СССР (1985 г.), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР.

ДА ТАТЭРМІНОВЫ СЛЕД «ЧАСОВАГА» ДЫРЭКТАРА

Доўгі час [illegible] дырэктарату. [illegible] ліст нядрэнны [illegible] пройдзе месяц, [illegible] не выт[illegible] напружанай [illegible] раз, другі [illegible] атмасферы, [illegible] і праца [illegible] былую [illegible] сіле маральна [illegible] змірылася з [illegible] чалі задумва[illegible]

С. С. Шушкевіч — вядомы вучоны, які ўнёс дастойны ўклад у развіццё [illegible] і арганізацыю навуковых даследаванняў, прызнаны [illegible] ыяліст у галіне прыладабудавання.

В. ШАСТАПАЛАЎ, акадэмік.

ПРАГРАМА

кандыдата ў народныя дэпутаты СССР, прарэктара па навуковай рабоце, загадчыка кафедры ядзернай фізікі і электронікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, доктара тэхнічных навук, прафесара С. С. Шушкевіча

У выпадку майго выбрання на народным дэпутатам СССР я буду прадвяўляць ініцыятыву па падрыхтоўцы і галасаванць за прынятцо законаў, якія могуць забяспечыць:

— поўнае сацыяльнае раўнапраўе, адмену існуючых і забарону на ўвядзенне любых прывілеяў для функцыянераў і наменклатуры; прывілеі—толькі для дзяцей, цяжарных жанчын, маці малалетніх дзяцей, для інвалідаў вайны і працы, ахвяр стыхійных бедстваў, экалагічных катастроф і аварый;

— роўныя палітычныя правы і магчымасці грамадзян: правыя ўсебагульныя таямыя выбарыне менш чым з двума кандыдатамі на адно месца; поўную незалежнасць заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;

Навуковую экспертызу і ўсенароднае абмеркаванне заканадаўчых актаў, уключаючы рэферэндум па важнейшых пытаннях унутранай і знешняй палітыкі;

— сапраўдны суверэнітэт саюзных рэспублік, пашырэнне іх правоў да поўнай самастойнасці ў прынятці рашэнняў па нацыянальных, эканамічных, культурных і іншых пытаннях на аснове Канстытуцыі СССР;

— паляпшэнне эканамічнага становішча працоўных, прычым не толькі ў далёкай перспектыве, але і ў самы бліжэйшы час за кошт актывізацыі працоўнай дзейнасці, пераарыентацыі ў сферу матэрыяльнай вытворчасці шматлікіх катэгорый «супрацоўнікаў-пасрэднікаў», ліквідацыі глебы для адраджэння аўтарытарнага кіраўніцтва;

— права чалавека жыць у экалагічна чыстым асяроддзі;

— права прадаваць сваю працу, у тым ліку за валюту, г. зн. права на працу за мяжой;

— адмену прапіскі, права свабоднага выезду ў любую краіну.

— дэцэнтралізацыю кіраўніцтва эканомікай, набліжэнне зместу навучання да патрэб людзей у духоўнай, культурнай, эканамічнай сферы, выключэнне шаблонізацыі і уніфікацыі навучання на ўсіх узроўнях да поўнай аўтаноміі універсітэтаў і некаторых іншых навучальных устаноў;

— пастаноўку па-за законам любых форм знявагі чалавечай годнасці; ліквідацыю глебы для адраджэння аўтарытарнага кіраўніцтва;

— права чалавека жыць у экалагічна чыстым асяроддзі;

— права прадаваць сваю працу, у тым ліку за валюту, г. зн. права на працу за мяжой;

— адмену прапіскі, права свабоднага выезду ў любую краіну.

— раўнапраўе і арганізатараў», паніжэнне ваенных расходаў, гібкай падатковай палітыкі; перагляд структуры эксперту і імпарту;

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Камісія па радыеспектраскапіі АН СССР высока ацэньвае цыкл работ прафесара С. С. Шушкевіча па стварэнню малагабарытных спектрометраў магнітнага рэзанансу агульнага і спецыяльнага прызначэння, а таксама ўкараненню на гэтай аснове ў прамысловую практыку высокапрадукцыйнага метаду кантролю якасці адна- і шматслойнай эпітаксіі пры вытворчасці СБІС на ЦМД.

Гэтыя распрацоўкі неаднаразова абмяркоўваліся савецкай радыеспектраскапічнай грамадскасцю, нязменна атрымліваючы адабрэнне.

Э. ФЕДЗІН,
старшыня камісіі па радыеспектраскапіі АН СССР, прафесар.

• • •

Прафесарам С. С. Шушкевічам створана школа, якая абгрунтавала прынцыпова новыя канцэпцыі пабудовы радыеспектраскапічнай апаратуры з даволі шырокім спектрам выкарыстання ў фізіка-хімічных даследаваннях і прамысловасці, а апошнім часам атрыманы абнадзейваючыя вынікі па пабудове цалкам аўтаматызаваных спін-метачных аналізатараў для біялагічных даследаванняў і медыцынскай дыягностыкі.

І. ТАНАНАЕЎ,
акадэмік.

Інтэлігентнасць

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

З вялікім задавальненнем успрыняў вестку аб вылучэнні прафесара С. С. Шушкевіча кандыдатам у дэпутаты. З'яўляючыся старшынёй праўлення Цэнтральнай раённай арганізацыі таварыства «Веды», я вось ужо больш за дзесяць год ведаю Станіслава Станіслававіча як лектара, члена прэзідыума праўлення Мінскай гарадской арганізацыі таварыства «Веды».

А два гады таму С. С. Шушкевіч быў абраны старшынёй праўлення гарадской арганізацыі таварыства «Веды». Узначаліў ён гэту арганізацыю ў той час, калі наспела неабходнасць вырашыць нямала фінансавых і гаспадарчых праблем, што назапашваліся гадамі.

І ў тым, што зараз можна весці размову пра пазітыўныя перамены ў дзейнасці гарадской арганізацыі, безумоўна, ёсць заслуга С. С. Шушкевіча. Яго вызначаюць неардынарны погляд на існуючыя праблемы, шлях іх вырашэння, канструктыўнае мысленне. Пры яго зацікаўленым удзеле азначаны галоўныя напрамкі работе таварыства «Веды» на сучасным этапе, умацаваліся творчыя сувязі паміж ВНУ і прапрыемствамі горада, ажыццяўляцца падрыхтоўка лекторскіх кадраў.

Нямала зроблена Станіславам Станіслававічам і дзеля таго, каб народныя універсітэты усё актыўней далучліся да ўзбраення працоўных канкрэтнымі ведамі і вопытам, вырашалі пытанні павышэння кваліфікацыі кадраў, навучанне работе ў новых умовах гаспадарання.

Хочацца адзначыць, што гарадская арганізацыя таварыства «Веды» у ліку першых у краіне перайшла на гасразлік.

Добра ведаю Станіслава Станіслававіча і як лектара. Яго выступленні вызначае глыбокая навуковая змястоўнасць, даходлівасць. Яны выклікаюць нязменную цікавасць у слухачоў.

Прывабліваюць у ім і чыста чалавечыя якасці — інтэлігентнасць, вастрыня розуму, таварыскасць і добразычлівасць. Ён — чалавек актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Таму думаю, што калектыў Белдзяржуніверсітэта зрабіў правільны выбар.

М. ЛАМАКА,
старшыня Цэнтральнай раённай арганізацыі таварыства «Веды», доктар медыцынскіх навук, дырэктар НДІ пульманалогіі і іфтызіятрыі.

Плюс кампетэнтнасць

Адметная рыса С. С. Шушкевіча ў навуцы — абсалютная кампетэнтнасць. Здавалася б, інакш і быць не можа, калі гаворка ідзе пра вучонага, іншынера. Але калі ўспомніць, якой бывае цана некампетэнтнасці (вазьміце той жа Чарнобыль), становіцца зразумелай яе каштоўнасць.

Дарэчы, наш кандыдат — адзін з тых людзей, хто рабіў і робіць усё магчымае (як грамадзянін, як прарэктар па навуковай рабоце і як загадчык кафедры ядзернай фізікі) для ліквідацыі вынікаў Чарнобыльскай аварыі.

Бясспрэчна, можна гаварыць пра школу С. С. Шушкевіча ў навуцы і выкладчыцкай дзейнасці. Яго вучні — дактары і кандыдаты навук. Го узнагароды — прэмія Савета Міністраў СССР за распрацоўку і ўкараненне новай тэхнікі, Дзяржаўная прэмія БССР за падручнік «Асновы радыёэлектронікі», рэкамендаваны Дзяржкамітэтам па народнай адукацыі адзінаму падручнікам для вэчных спецыяльнасцей універсітэтаў краіны. Яго гордасць радасць — кафедра ядзернай фізікі,—на маю думку, лепшая кафедра на прыродазнаўчых факультэтах універсітэта.

С. С. Шушкевіч сваю лю вытокаў стварэння Інсціітута ядзерных праблем пры універсітэце. Мазгавы і праблемы цэнтр інсціітута, кіруемы прафесарам У. Р. Барышэўскім, склаўся на кафедры пры якім садзеяні С. С. Шушкевіча. На першым вечары адпачынку супрацоўнікаў НДІ ЯП, куды быў запрошаны Станіслаў Станіслававіч, яму быў уручаны «макет» нованароджанага дзіцяці з надпісам на стужцы: «НДІ ЯП».

Вялікія маштабы і глыбіня навуковых даследаванняў ва універсітэце. Толькі навукова-даследчых інсціітутаў ва універсітэце — тры. Шмат праблем даводзіцца вырашаць прарэктару С. С. Шушкевічу. І заўсёды ён робіць гэта без прамаруджання.

М. ШУМЕЙКА,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце НДІ ЯП, прафесар.

ТАВАРЫШЫ ВЫБАРШЧЫКІ!

Уся краіна чакае, калі пачне работу новы Вярхоўны Савет СССР, састаў якога выбіраўся сапраўды ўсенародна.

Выбаршчыкам Маскоўскага і Фрунзенскага раёнаў г. Мінска яшчэ трэба будзе сказаць свае слова. Усе кандыдаты — людзі дастойныя. Просім вас уважліва і ўдумліва падысці да выбараў і памятаць, што кандыдат у народныя дэпутаты СССР СТАНІСЛАЎ СТАНІСЛАВАВІЧ ШУШКЕВІЧ, на наш погляд, не толькі добра бачыць праблемы краіны, але і можа актыўна змагацца за ажыццяўленне канструктыўных ідэй. Дапамогуць яму ў гэтым кваліфікацыя прафесара-фізіка, педагога, вопыт арганізацыйнай і асветніцкай работы, дастойныя асабістыя якасці.

Пазнаёмцеся з ім у час сустрэч з выбаршчыкамі і вы, напэўна, згадзіцеся з намі.

ІНТЭРВ'Ю З КАНДЫДАТАМ

САМАЯ ПАТРЭБНАЯ КНІГА

Прарэктару Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, прафесару С. С. Шушкевічу і дацэнту М. К. Яфімчыку прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР за падручнік «Асновы радыёэлектронікі». Прапануем чытачам гутарку з С. С. Шушкевічам.

— Станіслаў Станіслававіч, прысуджэнне Вам Дзяржаўнай прэміі БССР за падручнік — цікавая з'ява, а калі ўлічваць тую акалічнасць, што вышэйшая ды і агульнаадукацыйная школы перажываюць крызіс на дыдактычную літаратуру, то гэты факт набывае асаблівае значэнне.

— І напісанне падручніка, і прысуджэнне прэміі за падручнік — не такая ўжо рэдкасць у БДУ. Зусім нядаўна — у 1984 годзе — Дзяржпрэмію БССР за падручнік атрымаў прафесар І. К. Лапацін. Менавіта ў той час супрацоўнікі БДУ штогод друкавалі каля 200 падручнікаў і дыдактычных дапаможнікаў. Цяпер гэта лічба складае прыкладна 40.

Што здарылася? Наступіў крызіс? Не, перасталі лічыць падручнікамі тыя выданні, якія не дазваляюць студэнту стварыць цэльнае ўяўленне аб асновах канкрэтнага агульнаадукацыйнага курса.

Цяпер пра якасць падручнікаў. Ніхто не імкнецца пісаць дрэнны падручнік і, прабачце, я не магу прыпомніць, каб ва універсітэце за напісанне такой кнігі браліся супрацоўнікі, недаскналя валодаючыя прадметам.

Як бачыце, і намеры станоўчыя, і спецыялісты высокай кваліфікацыі, але вынік не заўжды якасны.

Чаму? Ды вельмі проста! Каб напісаць (так-так — навучыцца!) пісаць падручнікі, канспекты лекцый, дапаможнікі і г. д., трэба рабіць гэта не адзін раз у жыцці, а штодзённа набываць навыкі такой працы: пісаць, абмяркоўваць, асэнсоўваць, я б сказаў, існаваць у асяроддзі стварэння і падрыхтоўкі да друку дыдактычных распрацовак.

На жаль, такая магчымасць не дадзена амаль нікому выкладчыку. Распрацоўка дыдактычных матэрыялаў і падрыхтоўка іх да друку радка ўключаюцца ў план работы кафедры і асабісты план выкладчыка. Маладым супрацоўнікам пісаць для студэнтаў, дакладней, для тых, хто вучыцца, нявыгадна. Лепей і лягчэй пісаць для тых, хто вучыць. Дысертацыю па падручніку абараніць цяжка (у БДУ такога не прыпамінаю), ганарар нават за шматгадовую працу — нявялікі. Прафесару і дацэнту таксама лепш надрукаваць манаграфію (нават «мікраманаграфію») і да яго прыбудуць аўтарытэт і пашана нават з боку тых, хто ніводнага слова ў гэтай кнізе не разумее...

А падручнік, калі спадабаецца выкладчыкам, то можа прыйсціся не да густу студэнтам, і наадварот.

— Перашкодай, напэўна, з'яўляецца тое, што ні ў дырэктыўных дакументах, ні ў праграме перабудовы вышэйшай адукацыі не створаны механізм падрыхтоўкі падручнікаў. Пакуль што гэта справа здзяйсняецца асобнымі аматарамі.

— Хто браўся за напісанне падручніка, ведае цяжкасці гэтай працы.

І мы не надрукавалі б свой падручнік, каб не адпаведнае асяроддзе. Я маю на ўвазе калектыў супрацоўнікаў кафедры ядзернай фізікі і электронікі, якім створана нямала кніг для студэнтаў, распрацаваны сучасныя методыкі і абсталяванне для лабараторных практыкумаў і іншыя дыдактычныя матэрыялы. Мы абмеркавалі і змест, і методыку выкладання асноў радыёэлектронікі спачатку на кафедры, пасля на некалькіх рэгіянальных і саюзных канферэнцыях і, нарэшце, атрымалі падтрымку навукова-метадычнага савета былога Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР. Такім чынам, прапанаваная БДУ праграма была зацверджана ў якасці ўсеагульнай і не ва падставе былі створаны тры выданні падручніка, апошні з іх адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Нам пашанцавала. Асноўная ж частка стварэнніка знаходзіцца ў больш складаным становішчы.

— Як следства такога становішча — студэнты вельмі дрэнна забяспечаны вучэбнай літаратурай, засталіся амаль без падручнікаў. Адсюль і нізкая якасць ведаў, што горшым чынам адбіваецца потым на іх працы на вытворчасці.

— На жаль, гэта так. Былое Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у свой час манапалізавала выданне падручнікаў. Дабіцца саюзнага грыфу для выдання падручнікаў у рэспубліцы было амаль немагчыма, што з'явілася яшчэ адным фактарам адлучэння вучоных ад іх стварэння. Цяпер перашкод паменшылася, але магчыма, па інерцыі ніхто не ірвецца іх пісаць.

— Мы назіраем такі парадокс. Большасць спецыяльных кафедраў не забяспечаны падручнікамі і, зразумела, пакінь мець свае аўтарскія дапаможнікі. Але яны іх не маюць і не робяць актыўных крокаў, каб ліквідаваць такое становішча. Такім чынам, новых падручнікаў мы стваряем вельмі мала, што супярэчыць сучаснаму разуменню падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

— Я ўпэўнены, што на ўсіх факультэтах універсітэта ёсць сілы, каб стварацъ сучасную дыдактычную літаратуру.

Хачу заўважыць таксама, што пісацъ падручнікі — абавязак выкладчыкаў, пажадана, каб менавіта гэтыя выкладчыкі былі і вучонымі.

— Сучасны ўзровень падручніка. Што ўваходзіць у гэту ацэначную характарыстыку?

— Падручнік — гэта канцэпцыя зместу і метадаў вывучэння, якую прапануе аўтар. Па адному і таму ж курсу могуць (і павінны!) існаваць падручнікі розных аўтараў, кожны з якіх імкнецца ажыццявіць ім задуманае. Зноў жа павінны мець права на жыццё розныя падыходы, а ў адной і той жа аўдыторыі ў кожнага з аўтараў могуць знайсціся і прыхільнікі, і «ворагі».

Што датычыцца агульнадыдактычных патрабаванняў, то яны даўно сфармуляваны класікамі педагагічнай навукі: даступнасць, яснасць, паслядоўнасць, паўната, пераймальнасць і г. д.

Асабліва я лічу, што падручнік павінен быць сцісым, і падзяляю пранаанне тых, хто сцвярджае, што ва універсітэце (і ў ВНУ наогул) могуць існаваць падручнікі толькі па агульнаадукацыйных курсах.

«Час жыцця» падручніка параўнальна невялікі, яго абнаўленне і перавыданне (калі яно не страціла сэнсу!) робіцца ў сістэме вышэйшай школы праз пяць гадоў. Нярэдка гэты перыяд завяршаецца і, на жаль, маюць рацыю тыя, хто лічыць, што падручнікі хутчэй старэюць, чым пішуцца.

— І ўсё ж, дзе выйсце? Студэнт вельмі заклапочаны. Пераход на індывідуальны шлях навучання, кантроль ведаў на працягу семестра вымушаюць перабудоўвацца і студэнцтва. Цяпер ужо да сесіі жывецца не так і весела, таму што для сістэмнай працы неабходна ўзброенасць вучэбнай літаратурай.

— Выхад ёсць, дакладней, у працэсе перабудовы вышэйшай школы шлях да яго абазначыўся.

Я маю на ўвазе рэальную магчымасць выдаваць падручнікі на заказных падставах, калі універсітэт цалкам разлічваецца з выдавецтвам за рэдагаванне і друк кнігі.

Някіх пазаўніверсітэцкіх узгадненняў і дазволаў пры гэтым не патрабуецца, а тэрмін перавтварэння рукапісу ў кнігу скарачаецца. Сродкі на выданне адносна невялікія і іх можна знайсці, напрыклад, друкаваць падручнікі за кошт прыбытку за навукова-даследчую дзейнасць па гаспадарчых дагаворах.

Уся адказнасць за якасць прыпадае пры гэтым на універсітэт і не трэба гэтай адказнасці палохацца.

— Ваш падручнік надрукаваны на рускай мове. А цяпер ва універсітэце распрацоўваецца дабгатарміновая праграма беларусізацыі. Як тут быць з вучэбнай літаратурай? Не толькі студэнты гуманітарных, але і прыродазнаўчых факультэтаў выказваюць пажаданні аб пераводзе дысцыплін на беларускамоўнае выкладанне.

— За выключэннем кніг па самой беларускай мове і літаратуры ні падручнікаў, ні сучасных дыдактычных дапаможнікаў, напісаных па-беларуску, у БДУ няма. Больш таго, нягледзячы на мноства папер і размоў аб хібах мінулага, няхіх дзейсных крокаў у кірунку ліквідацыі небеларускага адпамоўя я не бачу. Паспрабуйце ў БДУ на беларускай мове надрукаваць старонку рукапісу: на дзесяці з дванаццаці факультэтаў вы не зможаце гэтага зрабіць, бо не знойдзеце машынкі з літарамі «і» і «ў».

На многіх факультэтах і кафедрах марна страціце час у пошуках прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, навукоўцаў, нарэшце, наогул супрацоўнікаў, якія б валодалі беларускай мовай на ўзроўні, адпавядаючым універсітэцкаму. Працаваць над беларускамоўнымі падручнікамі ў такіх умовах, прабачце, могуць героі або Дон-Кіхоты.

Беларускасць толькі на шыльдзе — улацівасць амаль што ўсіх навучальных устаноў рэспублікі, таму змяніць становішча можна толькі дзейснымі агульнарэспубліканскімі намаганнямі. На маю думку, і палітыка нашага міністэрства па пытаннях двухмоўя не адзначана дзейснасцю. У яго пастановах, у прыватнасці, няма ніякіх захадаў па стварэнню ўмоў, якія спрыялі б напісанню беларускамоўнай дыдактычнай літаратуры для студэнтаў.

Так што, як і ў часы культу, валюнтарызму і застою пакуль што можна спадзявацца толькі на патрыятызм саміх выкладчыкаў і навукоўцаў.

— Прабачце, але асабіста Вы не адчуваеце такой патрэбы?

— Адчуваю. Але не ў галіне радыёэлектронікі. З-за фактычнай адсутнасці сучаснай беларускай тэрміналогіі ў гэтай галіне такі падручнік быў бы прыстасаваннем для правядзення даследаванняў над... студэнтамі. А яны вельмі не любяць быць у якасці падапытных кралікаў.

Гутарку вёў дэкан факультэта журналістыкі А. СЛУКА.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Падтрымліваю прафесара Станіслава Станіслававіча Шушкевіча...

Яго навуковыя дасягненні па месбауэрскаму і магнітна-рэзанансному прыладабудаванню, а таксама створаная ім школа спецыялістаў, якія працуюць у галіне электронікага прыладабудавання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, даюць усе падставы лічыць яго дастойным прэтэндэнтам.

В. ГАЛЬДАНСКІ,
акадэмік.

• • •

С. С. Шушкевіч як спецыяліст з шырокім кругагляданм здолеў не толькі арганізаваць распрацоўкі і серыйную вытворчасць унікальных складаных радыёспектраскапічных прылад, але і актыўна ўкараніе іх у розных галінах народнай гаспадаркі.

Я. КАЛАТЫРКІН,
акадэмік.

Распрацаваныя пад яго кіраўніцтвам магнітна-рэзанансныя прылады не маюць аналагаў у СССР і за мяжой, укараніены ў многіх НДІ АН СССР, галіновых НДІ, на прадпрыемствах электронікі, радыётэхнічнай, хімічнай прамысловасці.

П. САЛАЖАНКІН,
віцэ-прэзідэнт АН Таджыкскай ССР.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

Я СУСТРЭЎ НЕАРДЫНАРНУЮ АСОБУ

Што ўразіла мяне на кафедры Шушкевіча, дзе я вось ужо трэці месяц стажыруюся? Атмасфера добразычлівасці. Калі гэта перастала мяне здзіўляць? Як толькі бліжэй пазнаёміўся са Станіславам Станіслававічам. Гэта выдатны кіраўнік, рэдкі знаўца сваёй справы і выключны чалавек. Такіх і ў вас, і ў нас, у Злучаных Штатах, мала.

Я слухаў выступленні многіх кандыдатаў у дэпутаты і зразумеў: яны пакуль гаварыць, а ён нямала зрабіў.

Я б галасаваў за яго абедзвюма рукамі. Але я толькі магу выказаць свае ўражанні.

Што яшчэ? Калі ў Вярхоўным Савеце будуць працаваць такія людзі, як ён, я паверу, што ваша выбарная сістэма найлепшая.

Ю. АРЭХВА,
(на здымку справа),
грамадзянін ЗША, менеджэр Арагонскай Лабараторыі штата Ілінойс.

ХТО МЫ? ЯКІЯ ВЫ?

КАМАНДЗІРОЎКА ЗА МЯЖУ

Мне не давялося набываць замежны пашпарт. Спатрэбіўся толькі «пятак». Я спусцілася ў метро і даехала да «Інстытута культуры». Мінуўшы будынак юрыдычнага факультэта, апынулася ля парога за мяжу.

На Маскоўскай, 15 (дзе размешчана аддзяленне міжнароднай журналістыкі) ідзе сваё жыццё. Тут вучацца 182 замежныя студэнты: сацыялістычныя краіны, Сірыя, Афганістан, Палесціна, Уганда і іншыя. Сапраўдная інтэрнацыянальная рэспубліка атрымалася.

ОСКАР прыехаў з Афганістана. З кім з савецкіх людзей ён хацеў бы сустрэцца і аб чым спытаць? Саід разумее пытанне, але назваць канкрэтнае прозвішча яму цяжка.

— Хацеў бы больш ведаць, што адбываецца дома: раней праз дзень атрымліваў афганскія газеты, цяпер — не даходзяць чамусьці нават лісты ад родных. І наогул, было б цікава пагаварыць з кампетэнтным субяседнікам па афганскай праблеме. Гатовы і сам паспрачацца за «круглым сталом» аб палітыцы перабудовы, аб тым, што адбываецца ў Прыбалтыцы і Грузіі.

Дарэчы, такая магчымасць часам выпадае. Саід разам з сябрамі з Емена, ГДР, Сірыі два разы ў месяц наведвае заняткі ў Вышэйшай партыйнай школе.

— А я лічу,— уступае ў размову ДАБУЛ ФАРАЖАЛЛАХ,— мне пашанцавала, што апынуўся тут у такі час. Краіна мела вялікую патрэбу ў карэнных пераўтварэннях. Перабудова — гэта добра. Але навошта зноў пераходзіць з адной крайнасці ў другую. З'яўляюцца людзі, гатовыя крытыкаваць усіх, ставіцца негатыўна да ўсяго. Нельга адмаўляць усё. Немагчыма паправіць справы вытворчасці аднымі словамі.

У час перадвыбарнай барацьбы (у гэтым годзе я ўпершыню бачыў такую актыўнасць савецкіх людзей) кожны кандыдат прапанаваў сваю праграму, а часам здавалася, што ствараліся яны па аднаму ўзору: экалогія, сацыяльная сфера... Разумееш, праграма не можа выражаць меркаванне аднаго чалавека. Адзін горы не зверне. Многія ў вас пакуль гэтага не разумеюць.

Нягледзячы на кароткую адлегласць — адна станцыя метро, камандзіроўка, сапраўды, паходзіла на замежную. Яна дазволіла зірнуць на сябе IX вачыма. Так яны думаюць пра нас. Не ўсе выказванні маіх субяседнікаў бясспрэчныя. Аднак і кожнаму з нас ёсць аб чым падумаць. Напрыклад, як адчуваюць сябе ва універсітэце нашы госці — замежныя студэнты? Ці стаў для іх утульным домам інтэрнат? Ці знайшлі яны паразуменне з суседзямі па аўдыторыі?

Мы запрашаем да размовы ўсіх чытачоў: выкладчыкаў, замежных навучэнцаў, студэнтаў.

М. ПЯТРОВА.

На здымках (злева направа):

СОНДЭЙ АДЭЛАДЖА, ДАБУЛ ФАРАЖАЛЛАХ, МІШЭЛЬ ДЫУРА, МАХМУД ХЕЛАН.

Фота С. ГРЫЦА.

МІШЭЛЬ ДЫУРА, студэнт з Кот Дывуара, вучыцца на першым курсе.

— Як ты адкрываў для сябе Савецкі Саюз?

— З расчаравання. У нас СССР — ідэал для ўсіх. Вельмі многія хацелі б абавязкова наведаць вашу краіну. Я таксама лічыў: лепш адзін раз убачыць, чым сто пачуць. У мяне былі вялікія надзеі. На сустрэчы з добрымі і таварыскімі людзьмі, якія б дапамагалі мне ў складаных сітуацыях (калі ты далёка ад дому і родных, нават параду няма ад каго атрымаць). Нам вельмі цяжка. А як адчувалі б сябе вы, калі б з усіх бакоў у тэатры, у кіно, у магазіне, проста на вуліцы на вас глядзелі, як на нейкае непаразуменне? Многія, не стрымліваючыся, выкрыкваюць наўздагон крыўдныя мянушкі. Не кожны працягне табе руку. Чаму размовы з выкладчыкам і тыя не павінны выходзіць за межы вучэбнага плана? А нам так хацелася б пазнаёміцца бліжэй з савецкімі людзьмі...

Студэнт з Нігерыі СОНДЭЙ АДЭЛАДЖА да таго, як прыехаў вучыцца, ведаў толькі, што «Савецкая дзяржава заснавана Леніным, у ёй пабудаваны сацыялізм і ўшчэнт разбурана вера ў бога». Ён ніколі не бачыў савецкага чалавека, не чуў рускай мовы. Яму вельмі падабаецца краіна, дзе не існуе раздзялення на бедных і багатых.

Праўда, спачатку ён ніяк не мог зразумець, чаму многія, убачыўшы яго, пачыналі з'едліва ўсміхацца. Потым здагадаўся: такая ў іх рэакцыя на чорны колер скуры. Дзіўна для Сондэя і тое, што ў краіне, якая адзіная прыйшла на дапамогу яго роднай Нігерыі ў час грамадзянскай вайны (1967—1970 гг.), людзі не выхоўваюцца ў духу «бытавога» інтэрнацыяналізму.

— А савецкія студэнты, якія яны?

МАХМУД ХЕЛАН ужо тры гады жыве ў інтэрнацыянальных пакоях: два курсы на журфаку плюс падрыхтоўчы факультэт:

— Крыўдна, што кожны год даводзіцца рабіць «вялікае» перасяленне. Невераго дна, што мы не вучымся разам з савецкімі студэнтамі і сустракаемся толькі на канферэнцыях ці агульных сходах. Магчыма, таму і сяброўскія адносіны абмяжоўваюцца словамі прывітання?

Не, на адсутнасць увагі да яго асобы ці на адмаўленне ў дапамозе Махмуд не можа паскардзіцца: растлумачаць і пацікавяцца, як зразумеў. І сяброў пасля работы ў інтэрнацыянальным студэнцкім атрадзе ў яго многа. Ва ўсялякім выпадку, па гасцях можна хадзіць увесь дзень: дзеля цябе адкладуць усе справы, абавязкова пачастуюць гарбатай. Гэты звычай Махмуду па душы. Тым больш, што пераймаюць яго і сябры з Лаоса, В'етнама, Кубы.

— Толькі,— Махмуд раздумвае, ці варта гаварыць пра непрыемнае, і працягвае,— у іх нейкія незразумелыя адносіны да вучобы. Па прынцыпу: менш працаваць — лепей жыць. Як гэта растлумачыць? Для іх, здаецца, работа і вучоба не ўзаемазвязаны. А пяць год ва універсітэце здаюцца ім працягам дзяцінства. Магчыма, таму так распаўсюджаны нічым не занятыя кампаніі?

Чацвёртакурснік САІД

СЛОВА УРАЧУ

ГАСТРЫТЫ, НЕЎРОЗЫ І... ПРАПІСНЫЯ ІСЦІНЫ

Хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць. Таму работнікі службы урачэбнага кантролю за тымі, хто займаецца фізічнай культурай і спортам, створанай пры студэнцкай паліклініцы, імкнуцца ахапіць прафілактычным медыцынскім аглядам усіх навучэнцаў. І хоць не так лёгка ажыццявіць гэта (студэнты усімі праўдамі-няпраўдамі спрабуюць «улізнуць»), тым не менш работа праводзіцца вялікая.

Мэта медагляду — выяўленне хворых з далейшай пастаноўкай іх на дыспансерны ўчот урачамі розных спецыяльнасцей, правядзеннем аздараўленчых мерапрыемстваў, а таксама размеркаваннем навучэнцаў па групах для заняткаў фізічнай падрыхтоўкай. Праходзяць яго ў асноўным студэнты першых — трэціх курсаў. Вынікі, прама скажам, несуцяшальныя. Напрыклад, у гэтым навучальным годзе 18 працэнтаў першакурснікаў будуць праходзіць комплекснае аздараўленне.

Вялікай увагі патрабуюць дыспансерныя хворыя. А іх не так мала. Па стану на 1 студзеня гэтага года на дыспансерным уліку ў спецыялістаў усіх профіляў стаяла 817 студэнтаў БДУ. Чым жа часцей за ўсё хварэюць нашы навучэнцы? Так, вы здагадаліся: страўнікавымі захворваннямі (на ўліку стаіць 313 чалавек). Нічога дзіўнага: як харчуемся, такое і здароўе. І не толькі ў пунктах грамадскага харчавання тут справа. Мы і самі прывыклі перакусваць абы як, подбежкам, усухамятку. А бывае і грошай не хапае. Не хочацца паўтараць вядомыя прапісныя ісціны, але ўсё ж напомню, што эканоміць на ўласным страўніку не варта.

Шмат студэнтаў пакутуюць ад захворванняў сістэмы кровазвароту (126 чалавек), неўрозаў, нейра-цыркулятарнай дыстаніі (112 чалавек), гінекалагічнай і хірургічнай паталогіі, захворванняў органаў зроку.

Медыцынскія агляды студэнтаў другіх-трэціх курсаў прадугледжваюць кантроль за фізічным развіццём, карэкціроўку нагрузак у групах па фізічнай падрыхтоўцы і ў спецыяльных медыцынскіх групах (ЛФК). Але ахапіць гэтай работай усіх студэнтаў таксама немагчыма.

Здавалася, можна было б спадзявацца на дапамогу дэканатаў, бо, як вядома, поспех у справе аховы здароўя толькі на 20 працэнтаў залежыць ад медыцынскіх работнікаў. Праўда, пакуль што асабліва цесных кантактаў няма, прынамсі, з дэканатамі фізічнага, гістарычнага факультэтаў, факультэта журналістыкі. Напэўна, там не разумеюць, што здароўе чалавека — гэта багацце дзяржавы.

В. ДАШКЕВІЧ,
урач.

Адкуль пайшла Белая Русь?

Гэта тэма вялікай і шчырай размовы і назва вечара, што днямі адбыўся ў Палацы культуры Мінскага вытворчага тонкасуконнага аб'яднання імя Ц. Я. Кісялёва. У зале сабраліся тыя, хто неабыякавы да лёсу роднай мовы, каго цікавіць гісторыя бацькаўшчыны. А на сцэне, змяняючы адзін аднаго, выступалі гісторыкі М. І. Ермаловіч, М. Ф. Філіпенка, П. А. Лойка, І. А. Юхо, літаратуразнаўца У. А. Чамярыцкі, гучалі песні і кантаты ў выкананні народнай капэлы і народнага хору народнай песні супрацоўнікаў і выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта. У выкананні «Неруша» і «Крыжачка» былі прадстаўлены фальклорныя танцы і харэаграфічныя замалёўкі.

Вострым сатырычным позіркам на сучаснае становішча аховы і аднаўлення гістарычных помнікаў у рэспубліцы стала выступленне дзіцячага тэатра «Усмешка» СШ № 140.

Аб цікаўнасці гледачоў да ўзнятых праблем гаворыць той факт, што пасля ўсіх выступленняў пісьменнікам давялося адказваць на шматлікія запіскі з пытаннямі.

С. ГРЫЦ.

СУСТРЭЧА

САРЭМ ЧЫТАЕ ЛЕНІНА

Мы пазнаёміліся з Сарэмам Махмудам у час правядзення Ленінскага ўрока для навучэнцаў падрыхтоўчага факультэта універсітэта. Я адразу звярнула ўвагу на стройнага хлопца, які з захапленнем слухаў усё, што гаварылі пра вялікага правадыра пралетарыяту.

Сарэм прыехаў у Савецкі Саюз з Сірыі, каб прадоўжыць навучанне ў Беларускім політэхнічным інстытуце.

— Ваш горад вельмі прыгожы і чысты, людзі такія ветлівыя. Аднак калі мы прыехалі сюды, то сустрэліся з нечаканай рэчаіснасцю. Справа ў тым, што ў Сірыі ўсе часопісы і газеты пішуць: «Савецкі Саюз — краіна з развітым сацыялізмам. У савецкіх людзей ёсць усё...»

Але мы ўбачылі, што гэта не заўсёды так: таму што жанчынам даводзіцца гадзінамі стаяць у доўгіх чэргах, бегаць па магазінах у пошуках прадуктаў. А мужчынам задаваць сабе пытанне: як пракарміць сям'ю?

— Цікава было б даведацца, як ставяцца ў вашай краіне да падзей, што адбываюцца ў нас?

— Мы ведаем, што ў Савецкім Саюзе ідзе перабудова. Я з увагай сачу за падзеямі ў вашай краіне. Трэба сказаць, што нашы часопісы пішуць пра гэта вельмі мала.

Калі я спытала, што ведае Сарэм пра Уладзіміра Ільіча Леніна, якія яго работы чытаў, ён здзівіў мяне.

— Я чытаў «Жыццё Леніна» М. Прыляжаевай, успаміны Бонч-Бруевіча, М. Фоціевай, ленінскую работу «Эканамічны змест народніцтва», а таксама Завяшчанне У. І. Леніна. Дарэчы, яно было надрукавана ў Сірыі.

Н. БЯНЬКОВА,
наш няшт. кар.

КАБІНКА КАМЕНТАТАРА

ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

Трыццаць сёмая спартакіяда БДУ імя У. І. Леніна хуткімі тэмпамі набліжаецца да фінішу. Таму можна падвесці некаторыя вынікі спаборніцтваў. У мінулым годзе па суме ўсіх відаў першае месца занялі студэнты юрыдычнага факультэта. На другім быў фізфак, на трэцім — факультэт прыкладной матэматыкі.

Зрэшты, гэты «трыумвірат» даўно пануе на спартыўным Алімпе універсітэта, таму і сёлета ад яго чакалі перамог. Але нечакана ў барацьбу «трох кітоў» умяшаліся радыёфізікі. Не пажадалі мірыцца з леташнім пятым радком у турнірнай табліцы студэнты гэтага факультэта і далі сапраўдны «бой» нязменным лідэрам, пераблытаўшы ўсе табелі аб рангах. Зараз на п'едэстале неспакойна. Першынствуюць пакуль што тыя ж «бунтары»—радыёфізікі, аднак іх становішча не вельмі трывалае. Дыхаюць у спіну «абураныя» фаварыты спартакіяды юрысты, фізікі і факультэт прыкладной матэматыкі, у любы момант можа прыпаднесці сюрпрыз мехмат. Словам, напярэдзе цікавая і вострая барацьба.

А вось у ніжняй частцы табліцы асаблівых змен не назіраецца. Спрадвечнае змаганне за права быць перадапошнімі вядуць журналісты і біёлагі. Журфакаўцы гараць жаданнем падняцца з адзінаццатай прыступкі хаця б на дзесятую. Пасля першай паловы спартакіяды студэнты журфака замацаваліся за перадапошнім месцам, але ці надоўга — пакажа далейшы ход спаборніцтваў.

Спартыўнае жыццё універсітэта не замыкаецца, аднак, на ўнутраных, міжусобных баталіях. Нямала ўзнагарод атрымалі нашы спартсмены і на гарадскіх спаборніцтвах.

Нельга не адзначыць лёгкаатлетаў, заняўшых трэцяе месца на спаборніцтвах сярод ВНУ горада Мінска, а таксама іх трэнера В. Я. Шпігава.

Не падвялі сваіх савецкіх сяброў і замежныя студэнты. Выступаючы за БДУ, яны ва ўсіх відах спорту былі прызёрамі. У настольным тэнісе гонар універсітэта абаранялі карэйскія студэнты, якія вучацца на філалагічным факультэце. У першынстве па валейболу замежнікі перамаглі (з лікам 2:1) Ваенна-палітычнае вучылішча і прывабілі ў скарбонку перамог яшчэ адзін камплект узнагарод.

Праўда, самай важнай, самай дарагой узнагародай для кожнага спартсмена з'яўляецца сам удзел у спаборніцтвах, бо гэта дадатковы зарад бадзёрасці, эмоцый і добрага настрою.

А. СІВЫ,
студэнт факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

27 красавіка
Зак. 1621.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.